# ТЭНДЭНЦЫІ Ў КРЫМІНАЛЬНЫМ ЗАКАНАДАЎСТВЕ БЕЛАРУСКАЙ ССР У 20-30 ГГ. XX-ГА СТАГОДДЗЯ

**С. А. Гур'еў**

Крымінальнае права 20–30 гг. хх-га стагоддзя было адным з важнейшых сродкаў умацавання савецкай дзяржаўнасці.

Асноўныя змяненні ў крымінальным заканадаўстве адбываліся ў сферы ўзаемасувязі чалавека і дзяржавы, у гэты перыяд уводзяцца новыя склады злачынстваў, якія забяспечвалі функцыяніраванне дзяржавы дыктатуры пралетарыяту. Асаблівае развіццё атрымала сістэма пакаранняў.

Крымінальнае права БССР у 1919–1921 гг. грунтавалася не на законе, а на рэвалюцыйнай самасвядомасці дзеячаў розных рэвалюцыйных камітэтаў, трыбуналаў, Усерасійскай Надзвычайнай Камісіі і яе мясцовых органаў, судоў і іншых карных устаноў [1, с. 171–172].

Гэты працэс пачаўся адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі у адпаведнасці з Дэкрэтам «А судзе» ад 24 лістапада 1917 г. судам дазвалялася карыстацца ў сваёй дзейнасці папярэднімі законамі у той меры, у якой яны не былі адменены рэвалюцыяй і не супярэчылі рэвалюцыйнаму сумленню і правасвядомасці.

На Беларусі ў гэты час дзейнічалі ўсе законы РСФСР, бо яна была складовай часткай РСФСР. Пасля стварэння Беларускай ССР крыніцамі крымінальнага права заставаліся крымінальна-прававыя акты РСФСР, пачалі дзейнічаць і заканадаўчыя акты БССР, акрамя таго суддзі кіраваліся рэвалюцыйнай правасвядомасцю. Варта адзначыць, што роля апошняй была значнай.

12 снежня 1919 г. Народны Камісарыят Юстыцыі РСФСР выдаў інструкцыю народным судам «Кіруючыя пачаткі па крымінальнаму праву РСФСР», якая з'явілася першым кадыфікаваным дакументам у сферы крымінальнага права і была заклікана адыгрываць ролю Агульнай часткі савецкага крымінальнага права. Інструкцыя стала праобразам Агульнай часткі будучага Крымінальнага кодэкса РСФСР [2, с. 268]. У гэтым акце ўстанаўлівалася, што «пакаранне не ёсць помста за віну, не ёсць збавенне віны», адзінай мэтай пакарання абвяшчалася абарона і ахова ўмоў супольнага савецкага жыцця ад пасягальніцтваў. Адмаўленне ад паняцця віны ў крымінальным праве прывяло да таго, што з сярэдзіны 20-х да пачатку 30-х гадоў тэрмін «віна» быў увогуле падвергнуты астракізму [6, с. 83–84].

У 1921-1922 гг. заканадаўчыя органы БССР запазычвалі розныя законы РСФСР, уносячы толькі нязначныя папраўкі з улікам мясцовых умоў.

24 мая 1922 г. прымаецца Крымінальны Кодэкс РСФСР, які быў уведзены ў дзеянне 1 чэрвеня 1922 г. Гэта быў першы савецкі Кодэкс, заснаваны на прынцыпах так званага сацыялістычнага права, які меў зваротную сілу. З 1924 г. гэты закон стаў афіцыйна называцца «Крымінальны кодэкс Беларускай ССР».

Кодэкс 1922 г. насіў класавы характар, ён дапускаў магчымасць прымянення крымінальнага закону па аналогіі, што прыводзіла да значнага злоўжывання ў правапрымяняльнай дзейнасці.

За ўчыненне контррэвалюцыйных дзеянняў, бандытызм і некаторыя іншыя асабліва небяспечныя злачынствы закон прадугледжваў вышэйшую меру пакарання – расстрэл, аднак у Кодэксе гаварылася пра яе як пра часовую меру [4, с. 204]. Да асобаў, якія былі з ліку рабочых і сялян, гэтая мера прымянялася толькі ў выключных выпадках [5, с. 283]. Узрост крымінальнай адказнасці вызначаўся з 14 гадоў.

Пасля стварэння ў 1922 г. СССР на падставе першай агульнасаюзнай Канстытуцыі 1924 г. распрацоўваецца шэраг новых законаў, у тым ліку былі прыняты «Асноўныя пачаткі крымінальнага заканадаўства СССР і саюзных рэспублік», Палажэнне а воінскіх злачынствах, Палажэнне аб злачынствах дзяржаўных (контррэвалюцыйных і асоба для СССР небяспечных злачынствах супраць парадку кіравання).

Менавіта на аснове гэтых законаў у перыяд з 1926 па 1929 г. у савецкіх саюзных рэспубліках былі распрацаваны і прыняты новыя Крымінальныя Кодэксы. КК БССР, які змяшчаў артыкул аб аналогіі, быў прыняты 23 верасня 1928 г. Звяртае ўвагу тое, што ў ім перавага аддавалася крымінальна-прававой абароне дзяржаўных інтарэсаў.

Адмаўленне ад прынцыпу «няма злачынства без указання аб тым у законе» быў агульным для кодэксаў усіх саюзных рэспублік. Тым самым ствараліся магчымаці самавольства ў крымінальнай палітыцы ўвогуле, а таксама злоўжыванняў пры прымяненні закона.

Таксама да недахопаў КК БССР 1928 г. можна аднесці палажэнне, узятае з «Асноўных пачаткаў крымінальнага заканадаўства», дазваляўшае выкарыстоўваць меры сацыяльнай абароны не толькі да асобаў, здзейсніўшых злачынствы, але і да тых, хто з'яўляўся «небяспечным па сваёй сувязі з крымінальным асяроддзем ці сваёй мінулай дзейнасці» [3, с. 452–453].

У лістападзе 1929 г. была прынята агульнасаюзная пастанова аб аб’яўленні па за законам савецкіх грамадзян, якія засталіся за межамі дзяржавы, за што прадугледжваўся расстрэл у тэрмін 24 гадзіны з моманту выяўлення такой асобы і канфіскацыя маёмасці. Гэты закон таксама меў зваротную сілу.

З пачаткам калектывізацыі сельскай гаспадаркі крымінальнае заканадаўства БССР, замацаванае ў Крымінальным кодэксе 1928 г., пачало інтэнсіўна змяняцца, таму што пачала дзейнічаць сталінская формула аб абвастрэнні класавай барацьбы па меры руху да сацыялізму, на падставе чаго уводзіліся больш жорсткія меры пакарання. Адбываліся таксама негатыўныя змены ў крымінальна-працэсуальным праве, у сувязі з чым парушаліся правы асобы.

У гэты перыяд крымінальнае права набывае агульнасаюзны характар. У беларускі Крымінальны кодэкс уносяцца толькі тыя артыкулы, якія папярэдне былі прыняты вышэйшымі партыйнымі і дзяржаўнымі органамі СССР. У 30-я гады прымаюцца самыя жорсткія законы, накіраваныя супраць «ворагаў народа», «шкоднікаў», «дыверсантаў» і «раскрадальнікаў» сацыялістычнай маёмасці.

Адным з такіх нарматыўных актаў з'яўляецца Закон СССР ад 7 жніўня 1932 г. «Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай (сацыялістычнай) уласнасці», па якому крадзеж сацыялістычнай маемасці нават пры змякчаючых абставінах караўся расстрэлам ці пазбаўленнем волі на тэрмін не меньш за 10 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

У практыцы судовых органаў усталяваны законам максімум у адносна вызначанай санкцыі даволі часта разглядаўся як мінімум для прымянення пакарання па канкрэтнай крымінальнай справе.

Яшчэ больш узмацніліся гэтыя негатыўныя тэндэнцыі пасля прыняцця Закона 1 снежня 1934 г. пасля забойства Кірава, «Аб асобым парадку расследвання і разглядання крымінальных спраў аб тэрарыстычных актах супраць працаўнікоў савецкай улады». Па гэтаму закону некаторыя працэсуальныя гарантыі правоў асобы былі скасаваны.

8 чэрвеня 1934 г. у КК БССР быў уведзены новы склад злачынства – здрада Радзіме (шпіянаж, выдача ваеннай ці дзяржаўнай тайны, пераход на бок ворага, уцёкі ці пералёт за мяжу), за што прадугледжваўся расстрэл з канфіскацыяй маемасці.

У гэты перыяд парушаецца прынцып індывідуалізацыі пакарання. Рэпрэсіям падвяргаліся члены сям'і злачынцы, нават калі яны і не ведалі аб злачынстве. Закон супярэчыў агульнаму прынцыпу адказнасці толькі пры наяўнасці ў дзеянні складу злачынства. Толькі пасля смерці Сталіна гэта было адменена [8, с. 8].

Крымінальны закон 30-х гадоў быў жорсткі нават у адносінах да непаўналетніх. 7 красавіка 1935 г. за шэраг злачынстваў была ўведзена крымінальная адказнасць з 12-гадовага ўзросту, што знайшло адлюстраванне ў артыкуле 14 КК БССР. Я не знайшоў падцвержання прымя-

нення смяротнага пакарання да 12-гадовых падлеткаў. Магчыма, у сувязі з тым, што ў гэтым выпадку ўзнікала калізія з агульнай нормай аб смяротным пакаранні, па якой гэта мера прымянялася толькі з 14 годовага ўзросту.

2 кастрычніка 1937 г. ЦВК СССР прыняў пастанову аб павялічэнні максімальнага тэрміну пазбаўлення волі (з 10 да 25 год) за здзяйсненне найбольш цяжкіх дзяржаўных злачынстваў (шпіянаж, шкодніцтва і дыверсія) [7, с. 396].

Патрэбна адзначыць, што ў гэты перыяд выдаваліся розныя інструкцыі і загады НКУС СССР, Генеральнага пракурора СССР, іншых службовых асобаў і дзяржаўных установаў, якія яшчэ больш пагаршалі становішча падсудных і асуджаных.

Такім чынам, трыццатыя годы ўнеслі істотныя негатыўныя змены ў савецкім крымінальным заканадаўстве. У перадваенны (а затым і ваенны) час гэтыя тэндэнцыі працягваліся. Так, нават грамадскія адносіны ў галіне працы былі аднесены да крымінальна-прававых.

Толькі ў пасляваенны перыяд, пачаліся станоўчыя змены ў крымінальным заканадаўстве.

**Літаратура**


1. *Круталевіч В. А.., Юхо І. А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917 – 1945 гг.) / Мн., 1998. С. 171–172. (Беларуская навука).
2. *Баркоў А. У., Грунтоў І. А., Доўнар Т.І.* Крымінальнае права Беларусі: (закон, злачынства, адказнасць): Навуч. дапам. / Пад рэд. Баркова А.У.. Мн., 1997. С. 268. (Завігар).
3. Уголовное право. Общая часть / Под общей редакцией проф. В. М. Хомича. Мн., 2002. С. 452–453. (Тесей).
4. *Вішнеўски А. Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Вучэбны дапаможник / Мн., 2003. С. 204. (Акад. МУС Рэсп. Беларусь).
5. История государства и права Белорусской ССР: в 2 т. / Мн., 1970. Т. 1: (1917-1936 гг.). С. 283. (Наука и техника).
6. *Шишов О. Ф.* Руководящие начала по уголовному праву РСФСР 1919 г. – памятник советской уголовно-правовой науки // Правоведение. 1980. № 3. С. 83–84.
7. Сборник документов по истории уголовного законодательства СССР и РСФСР / М., 1953 г. С. 396.
8. Ведомости Верховного Совета СССР. 1959. № 1. С. 8.


## АДВАКАТУРА НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1918 – 1939 ГГ.

**В. А. Канапацкая**

У выніку падзей першай сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Беларусь апынулася ў надзвычай цяжкім і небяспечным стане.